

ДОБРЫ ВЕЧАР
Добрый вечер

СТАЛІЦА

ІНФАРМАЦЫЙНА - РЭКЛАМНЫ ШТОТЫДНЁВІК №14(20) 7 КРАСАВІКА 1995 ГОДА КОШТ 400 РУБ



Фота В. БЫКОЎСКАГА.

ХРОНИКА НЕДЕЛИ

АЛЕКСАНДР РУЦКОЙ ХОЧЕТ ПРИСОЕДИНИТЬ УКРАИНУ И БЕЛАРУСЬ К РОССИИ

Бывший вице-президент России Александр Руцкой выдвинут политическим движением «Держава» как претендент на пост президента на выборах 1996 года. На конгрессе политического движения «Держава» Руцкой обвинил Бориса Ельцина в том, что тот уничтожает российскую государственность, и заявил, что президент России готовит заговор с целью отложить президентские выборы. Руцкой пообещал, что в случае избрания его президентом он возвратит Россию в ее исторические границы путем воссоединения с Украиной и Беларусью.

НАЙДЕНО НЕИЗВЕСТНОЕ ЗАХОРОНЕНИЕ

В Щекотовском лесу в нескольких километрах от Гомеля найдено разрытое неизвестное захоронение. В нем обнаружено десятки костей, простреленных черепов, ржавые эмалированные кружки, гребни, сапоги, резиновые галоши. Сотрудники Гомельского областного краеведческого музея утверждают, что здесь не было массовых расстрелов фашистами партизан или местных жителей. Они предполагают, что трагическое событие могло произойти как до 1941 года, так и после 1943-го. Следствие по этому делу проводит прокуратура Гомельского района. Пока журналистам сообщено лишь то, что в местах захоронения найдены советские граждане.

«ВИТЕБСКИЙ КУРЬЕР» СООБЩАЕТ:

— Российские военные вывезли из Постав 54 тонны ракетного топлива «Самин». Груз отправился в Свердловскую область на утилизацию. Этот ядовитый компонент был оставлен российскими военными частями во время их вывода за пределы республики. Напомним, что белорусская фирма «Истком» продавала «Самин» как топливо для котельных.

СИМ.

СТАЛІЦА

Заснавальнік журналісцкі калектыў рэдакцыі газеты «Добры вечар»
Зарэгістравана ў Міністэрстве культуры і друку Рэспублікі Беларусь пад № 987

Галоўны рэдактар
Анатоль ЗЭКАЎ

Камп'ютэрная вёрстка: Я.Каждан, А.Маісеянка, А.Цітова.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г.Мінск, вул.Б.Хмяльніцкага, 10а

прыёмная 68-28-02
аддзел рэкламы 68-29-33 (факс 68-29-74)
бухгалтэрыі 32-38-94

Газета выходзіць 1 раз у тыдзень на беларускай і рускай мовах

Распаўсюджваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у розніцу

Падпісчыкам газеты «Добры вечар» дастаўляецца бясплатна

Тыраж—55000 экз.
Падпісана ў друк 7 красавіка
Заказ №934

Надрукавана ў друкарні выдавецтва «Беларускі Дом друку»
220041, Мінск, пр.Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

СВОБОДА СЛОВА

МЕЖДУНАРОДНЫЙ КОМИТЕТ ПО ЗАЩИТЕ ЖУРНАЛИСТОВ ОБЕСПОКОЕН ДАВЛЕНИЕМ НА СРЕДСТВА МАССОВОЙ ИНФОРМАЦИИ В БЕЛАРУСИ

Международный комитет по защите журналистов (CPJ) направил письмо на имя Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко. В нем, в частности, говорится: «Комитет по защите журналистов очень обеспокоен Вашим недавним решением, касающимся цензуры новостных репортажей, критикующих белорусское правительство. 17 марта 1995 года Ваше Превосходительство уволили Иосифа Середича, главного редактора «Народной газеты» и члена парламента, за публикацию письма, критикующего пророссийскую политику Вашей администрации. В указе Вашего Превосходительства говорится, что письмо «разжигает насилие и гражданское неповиновение». Указ также критикует журналистов за их безответственность и содержит предложение создать совет, контролирующий работу журналистов. В течение предвыборной кампании 1994 Вы, в случае избрания, обещали «ликвидировать государственную монополию на средства массовой информации, запретить политическую цензуру и преследование журналистов по политическим мотивам, разрешить свободное распространение информации, независимо от воли чиновников». К сожалению, после Вашего избрания президентом, пресса по-прежнему находится под давлением. 23 декабря 1994 г., в соответствии с Вашим распоряжением, газеты «Советская Белоруссия», «Рэспубліка» и «Звязда» вышли с белыми пятнами вместо доклада члена парламента о коррупции в президентской администрации. 25 декабря 1994 Ваше Превосходительство уволили Игоря Осинского, главного редактора газеты «Советская Белоруссия», который протестовал против Вашего распоряжения подвергать цензуре статьи, касающиеся доклада о коррупции в президентской администрации.

Являясь нейтральной организацией, которая защищает права журналистов во всем мире, CPJ, с уважением относясь к Вашему высокому статусу, настаивает на том, чтобы Ваше Превосходительство придерживались обещаний, данных во время предвыборной кампании, восстановили в правах уволенных журналистов и дали возможность белорусским средствам массовой информации работать без политического вмешательства. Просим Вас дать свои разъяснения».

СИМ.

ПРОКУРАТУРА ПРОДОЛЖАЕТ ИСКАТЬ ВЕДЗЬМАКА ЛЫСАГОРСКАГА

Как сообщил СИМ следователь по особо важным делам республиканской прокуратуры Валерий Комаровский, следствие по делу, связанному с публикацией в газете «Свабода» поэмы «Лука Мудзішчаў — прэзідэнт», продлено до 6 мая. Г-н Комаровский сказал, что прокуратуре даже с помощью автороведческой экспертизы пока не удалось установить, кто же скрывается под псевдонимом Вядзьмак Лысагорскі. По мнению экспертов СИМ, и после 6 мая вряд ли следствие станет известно настоящее имя автора поэмы «Лука Мудзішчаў — прэзідэнт». Поэтому, скорее всего, прокуратура попытается привлечь к ответственности главного редактора «Свабоды» Игоря Герменчука. Однако сделать это будет довольно сложно, поскольку г-н Герменчук является депутатом Верховного Совета.

СИМ.

ЭХО БЕДЫ

ПРОБЛЕМЫ ЧЕРНОБЫЛЯ ДО СИХ ПОР ОЧЕНЬ СЛОЖНЫ

Состоялась пресс-конференция министра здравоохранения Беларуси Инессы Дробышевской, посвященная проблемам Чернобыля. Говоря о проблемах людей, которые отказываются покинуть населенные пункты с высоким уровнем радиоактивного загрязнения, г-жа Дробышевская повторила аргументы Александра Лукашенко о том, что каждый должен сам выбирать место жительства и место смерти. При этом г-жа Дробышевская добавила, что лично она как министр выступала против такого решения проблемы. «Мы не скрываем от людей опасности, которая существует в зоне. Однако оставшимся в зоне людям мы постараемся оказать своевременную медицинскую помощь». Министр отказалась комментировать прошлогодний скандал, связанный с немецким профессором, которого г-жа Дробышевская якобы уличила в жульничестве по чернобыльской помощи, поступающей в Беларусь. «Есть иностранцы, оказывающие и более существенную помощь», — добавила она.

СИМ.

В ХАРЬКОВЕ СОЗДАНЫ ПИЩЕВЫЕ ДОБАВКИ ПРОТИВОРАДИАЦИОННОГО ВОЗДЕЙСТВИЯ

Большой интерес у предприятий России и фирм Болгарии вызвали разработки харьковского научно-производственного предприятия «Криасс», где созданы натуральные пищевые добавки лечебно-профилактического и противорадиационного воздействия. В основе добавок — природные продукты: черноплодная рябина, крапива и календула. На харьковской фабрике уже освоен выпуск противорадиационных вафель «Рябиновая ветка». Специалисты «Криасса» разработали также рецепты блюд с добавкой криапорошков для лечебно-профилактического питания.

СИМ.

В ГОМЕЛЕ ПРОЙДЕТ МИТИНГ ПАМЯТИ

Гомельский горисполком принял решение о проведении 26 апреля, в день 9-й годовщины катастрофы на Чернобыльской АЭС, митинга памяти. Постоянная комиссия по проблемам Чернобыльской катастрофы и экологии Гомельского горсовета пригласила принять в нем участие президента Беларуси, министра труда Александра Соснова и министра здравоохранения республики Инессу Дробышевскую, руководителей города и области, представителей общественных организаций.

СИМ.

НАВСТРЕЧУ ВЫБОРАМ

НЕДОВОЛЕН УКАЗОМ О ВЫБОРАХ

Лидер БНФ Зенон Позняк, комментируя указ президента о выборах, выразил уверенность, что текст указа обязательно заинтересует Комитет по правам человека ООН, Европарламент и Совет Европы. Перечислив статьи Конституции, которые своим указом нарушил Александр Лукашенко, Зенон Позняк подчеркнул, что появление такого указа возможно только в стране, где у власти находится хунта. Экс-спикер парламента Станислав Шушкевич подчеркнул, что появление этого указа выглядит странно, поскольку в Беларуси уже принят закон о выборах народных депутатов. Г-н Шушкевич не исключил, что в скором времени указ президента может поступить в Конституционный суд для рассмотрения на предмет его соответствия Конституции.

СИМ.

КАТАЛІЦКІЯ СВЯТЫ

ВЕРБНАЯ НЯДЗЕЛЯ

Апошняя нядзеля перад Вялікаднем называецца ВЕРБНАЯ альбо Пальмовая. У гэтым годзе — 9 красавіка. За пяць дзён перад укрыжаваннем Ісус Хрыстос увайшоў у Іерусалім. Святкаванне Уваходу Гасподняга ў Іерусалім распачалося ў старажытныя часы і прысвечана ўспаміну вядомай евангельскай падзеі, калі Ісус Хрыстос прыйшоў у горад для прынясця пакут і смерці на Крыжы.

Евангеліст Іаан апісвае ўрачыстае вітанне яго: «...Мноства народу, што прыйшло на свята, пачуўшы, што Ісус ідзе ў Іерусалім, узялі пальмовыя галіны, выйшлі насустрач Яму і ўсклікалі: «Асанна (слава)! Благаславёны, што ідзе ў імя Гаподне, Цар Ізраіля!»

О, які ж вераломны чалавек! Не пройдзе і пяці дзён, як той жа натоўп, поўны нянавісці, падмануты і пад'юшаны фарысеямі, будзе ўжо крычаць: «Укрыжуй Яго! Укрыжуй!». Як гэта падобна да нас!

У гэтую нядзелю ў знак ушанавання і памяці аб трыумфе Ісуса Хрыста асвячаюцца галінкі вярбы, ялаўца, часта ўпрыгожаныя кветкамі і стужкамі. Перад пачаткам святой Імшы святары свянцяць вербы, якія захоўваюцца да серады папяльцовай, якая заўсёды распачынае Вялікі пост. У папяльцовую сераду вербы спальваюцца, і гэтым попелам пасыпаюцца галовы вернікаў. Дома мы захоўваем гэтыя вербы разам з абразамі.

Тыдзень ад Вербнай нядзелі да Вялікадня называецца ВЯЛІКІМ ТЫДНЕМ. Гэта тыдзень разважанняў аб страшэнных муках і знявагах Ісуса Хрыста, аб Яго такой страшнай і ганебнай смерці дзеля нашага збавення і выратавання нашых душаў.

Молім Усемагутнага і міласэрнага Бога аб прабачэнні за нашу знявагу, за наша вераломства, за нашу жорсткасць і нецярплівасць да бліжняга, за наша бязвер'е, за пакуты і мукі, якія цярпеў за нас Ісус Хрыстос. Няхай добры Бог дасць магчымасць прайсці разам з Ісусам наш зямны шлях да вечнасці, да збавення з гэтымі пальмамі нашай веры і адданасці нашаму Збаўцу Ісусу Хрысту.

Уладзіслаў ЗАВАЛЬНЮК, пробашч касцёла Святых Сымона і Алены.

ВЕРБНАЯ Ў НАРОДНЫХ АБРАДАХ

Пасвянчэнне вербаў бярэ свой пачатак ад Евангелля Св. Яна, дзе мы чытаем: «...натоўп людзей набраў галінак пальмавых і выйшаў на спатканне Яму з воклічамі «Гасанна!» (Ян. 12, 13).

Для пасвянчэння звычайна бяруць галінкі вярбы, ялаўца, сасны, арэшніку. Нельга толькі браць галінкі асіны і таполі. Легенда тут такая. Калі па смерці Хрыста гэтую страшную вестку пачулі дрэвы, то вярба цяжка ўздыхнула і сказала: «Ён памёр, цяпер мае сумныя галінкі будуць схіляцца над вадой і плакаць слязьмі заранкі». Сасна сказала: «Ён памёр, і на знак жальбы прыму цёмны колер і буду шукаць мейсц бязлюдных». Вінаградная лаза, пачуўшы сумную навіну, шапнула: «З жалю пацямнеюць мае ягады, і з-пад прасу пацячэ Кроў Хрыста». А туя адзывалася: «Ён памёр, і я цяпер буду расці толькі на цвінтарах (на могілках), птушкі не будуць спяваць у маіх галінках». І толькі адна таполя была абыякавай і сказала: «Гэта мяне не датычыць. Ён памёр па віне грэшнікаў, а я невінаватая і застануся такой, як была». І таму яе галінкі і лісце пастаянна дрыжаць. А асіна адна з усіх дрэў згадзілася даць свае галіны для пятлі Юды, і таму цяпер тожа дрыжыць перад Богам.

У некаторых мясцовасцях «коцікі» вербныя глыталі ад хвароб горла. Прыйшоўшы дамоў з касцёла, звычайна тых, хто не быў на набажэнстве, білі вярбой са словамі: «Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень — Вялікдзень». Пальмамі заўсёды гаспадыні выганялі статак вясной першы раз на пашу. Попелам з мінулагодніх вербаў пасыпалі палеткі, агарод, каб былі плённы ўраджай, каб Бог захаваў ад граду, засухі і г.д., а жывёлу ад хвароб.

Альдона ПЛІСНЕВІЧ.



Сегодня днем по республике ожидается облачная с прояснениями погода. Местами — кратковременный дождь. Температура: Витебск — 4-6, Могилев — 5-7, Гомель, Минск — 6-8, Гродно — 7-9, Брест — 8-10 градусов тепла. В последующие двое суток временами осадки, порывистый ветер, температура воздуха будет постепенно понижаться. Наиболее низкая температура была ночью 7 апреля 1940 г. — минус 10,5 градусов, а самая высокая днем — 16 градусов тепла — 7 апреля 1984 года.

Вера ЧИЖИК, специалист Белгидромета.

СИТУАЦИЯ



ГОЛОДАЕТ «АЛЕКСАНДРИНА»

С 1993 года коллектив Минского салона красоты «Александрина» добивается права стать самостоятельным арендным предприятием. И хотя почти два года назад были получены разрешения на это дирекции объединения «Восход», управления бытового обслуживания и принято решение горисполкома о заключении договора об аренде площадей салона и имущества — воз и ныне на месте. Очень уж живуча тенденция «не пущать», не давать самостоятельности.

А люди хотят работать в полную силу и нормально зарабатывать, а не кормить административную надстройку. А посему коллектив «Александрины» решился на крайнюю меру — объявил голодовку. Об этом поставлены в известность руководство горисполкома, Кабинет Министров и администрация Президента.

Услышат ли они голос «Александрины»?

НА СНИМКЕ: коллектив салона «Александрина» на площади Независимости. Плакат, где были изложены требования голодающих, изъяла милиция.

Текст и фото Евгения КОЗЮЛИ, БЕЛИНФОРМ.

ГАНДАЛЬ

«БЕЛАЯ РУСЬ» САСУДЫ РАСШЫРАЕ, АЛЕ КІШЭНЮ ЗВУЖАЕ

На 30 працэнтаў у сярэднім павышана цана на белую гарэлку з 6 красавіка бягучага года. Як паведамілі БЕЛІНФАРМу, такое рашэнне прынята Мінсельгасхарчам і Камітэтам цэн Мінэканомікі па ўзгадненню з Мінгандлем з мэтай ліквідацыі стратнасці вытворчасці лікёра-гарэлачнай прадукцыі і папаўнення дзяржаўнага бюджэту.

З гэтага часу гарэлка «Пшанічная» і «Сталічная» ў бутэльках 0,5 літра ў звычайным афармленні будзе каштаваць з посудам 14700 рублёў, а ў спецыяльным і экспартным афармленні— 15200, гарэлка «Маскоўская» і «Руская» адпаведна 14500 і 15000, «Крышталь-100»—15500 і 16000 рублёў. І, нарэшце, закрывае асартымент «Белая Русь», цана якой падскочыла да 16100 і 16600 рублёў.

Тэрэза ХАЮЦІНА, БЕЛІНФАРМ.

НА ГРОДНЕНСКОЙ ТАМОЖНЕ ПРИБАВИЛОСЬ РАБОТЫ

Как известно, с 1 апреля, согласно указу президента, запрещено продавать табачные и алкогольные изделия импортного производства без акцизной марки. Например, налог на ввоз одного литра спирта составляет сейчас 3,8 доллара. Наверное, поэтому одна из фирм, которая ввозила через Гродненскую таможню 105 тонн спирта и должна была заплатить налог около 400 тысяч долларов, отправила спирт обратно в Голландию. Сегодня на Гродненской таможне один сотрудник наклеивает за смену акцизные марки только на 500 бутылок. Стоимость же маркировочной линии, которая значительно ускорит это процесс, составляет 150 тысяч долларов.

СИМ.

МИЛОСЕРДИЕ

И — НЕ СТРАШЕН ГРИПП

Название благотворительной акции «Антигриппин» говорит само за себя. Основная задача — помочь ослабленным от весеннего авитаминоза и страдающим от аллергии на медикаменты юным организмам противостоять коварному гриппу, преодолеть простудные заболевания.

Организаторы акции — Белорусский детский фонд и представительство в республике компании «Natur Produkt», всемирно известной по производству высококачественных медикаментов из натурального сырья.

Таблетки для профилактики и лечения воспалительных и инфекционных заболеваний полости рта и горла, для защиты от гриппозных инфекций «Анти-ангин», эффективный препарат против простуды, бронхита и от кашля «Шалфей», леденцы с экстрактом эхинацеи для профилактики заболеваний дыхательных путей уже получили маленькие подопечные Детского фонда — дети-сироты из опекунских, малоимущих, неполных семей, дети-инвалиды из Минска и детский дом семейного типа Сагайдаровых из Жодино.

Конечно же, очень хочется помочь всем-всем нуждающимся детям республики, обеспечить хотя бы наиболее социально незащищенную категорию детства витаминами, соками... Пусть небольшая по масштабам милосердная акция «Антигриппин» послужит хорошим примером плодотворного сотрудничества благотворительной организации и производственной компании в интересах детей.

Пресс—центр Белорусского детского фонда.


СОТРУДНИЧЕСТВО

ТАМОЖЕННЫЙ СОЮЗ ВЫГОДЕН

Председатель Государственного таможенного комитета республики Петр Кречко провел пресс-конференцию. Она была посвящена соглашению о таможенном союзе, заключенном Беларусью, Россией и впоследствии Казахстаном. Напомним, что это соглашение предполагает, в частности, унификацию законодательства, создание условий для беспрепятственного движения товаров на общей таможенной территории, выработку согласованной торговой политики по отношению к третьим странам. Как отметил г-н Кречко, реализация этого документа носит этапный характер, и на первом этапе предполагается унификация законодательства в таможенной сфере и в сфере внешнеэкономической деятельности. После выполнения первого этапа будут сняты таможенные барьеры, образовано единое таможенное пространство, разработан общий таможенный тариф по отношению к третьим странам. Председатель Таможенного комитета подчеркнул, что реализация первого этапа этого соглашения должна произойти к 6 мая, и Таможенным комитетом уже подготовлены соответствующие проекты по изменению действующего таможенного законодательства. На вопрос, что будет с проделанной работой в том случае, если Верховный Совет не утвердит таможенное соглашение, г-н Кречко ответил, что не может сказать, каковы будут действия Верховного Совета, но считает, что это соглашение никоим образом не ущемляет ни экономические интересы Беларуси, ни ее государственный суверенитет, а наоборот, принесет выгоды республике. «Снимая пошлины, снимая проблемы, которые сегодня существуют у субъектов хозяйствования, мы тем самым создаем нормальное экономическое правовое пространство для проведения рыночных реформ на территории государств, подписавших соглашение», — отметил г-н Кречко.

СИМ.

КУРС ТЫДНЯ



Сярэдні курс наяўнага $ ЗША ў банках Мінска з з 31 сакавіка па 6 красавіка

В ТЕНИ РЕФОРМ

ДИРЕКТОР МОГИЛЕВСКОГО СП «ДИАЛОГ» ОСВОБОЖДЕН ИЗ-ПОД СТРАЖИ

Как стало известно, 31 марта был освобожден из-под стражи директор белорусско-американского совместного предприятия (СП) «Диалог» Григорий Лишанский. Г-н Лишанский был арестован 2 марта нынешнего года по обвинению в краже 2 миллионов рублей. Напомним также, что одним из учредителей «Диалога» является АО «Моготекс», руководство которого обвиняется в хищении материальных ценностей и денежных средств предприятия. Комментируя по просьбе корреспондента СИМ факт освобождения из-под стражи г-на Лишанского, заместитель начальника Следственного комитета МВД Анатолий Смоленцев сообщил, что мера пресечения директору СП «Диалог» изменена на подписку о невыезде в связи с учетом обстоятельств дела и по состоянию здоровья. Однако уголовное дело в отношении г-на Лишанского не прекращено. Более подробный комментарий г-н Смоленцев дать отказался, сославшись на ведомственный приказ министра Юрия Захаренко, запрещающий сотрудникам МВД осуществлять контакты с журналистами, минуя пресс-службу министерства.

СИМ.

МЕСТНОЕ ВРЕМЯ

НА МОСТЫ И ДОРОГИ — ДЕНЕГ НЕТ

Городские власти Гомеля столкнулись с острой проблемой подготовки города к празднованию 50-летия Победы в Великой Отечественной войне. Как заявил начальник управления ремонтных служб горисполкома г-н Романьков, только на косметический ремонт большинства дорог и мостов областного центра необходимо около 10 миллиардов рублей. Для того же, чтобы заняться общим благоустройством Гомеля, у городских властей денег нет.

СИМ.

ЛЬГОТНЫЙ ПРОЕЗД ДЛЯ ДАЧНИКОВ ОПЛАТЯТ ГОМЕЛЬСКИЕ ПРЕДПРИЯТИЯ

Около тысячи рублей — такова фактическая стоимость одной поездки в общественном транспорте в Гомеле. Пассажиры платят только четыреста. Поправить материальное положение облавтоуправления должно, по мнению депутатов областного Совета, введение налога в размере 2% с прибыли, остающейся в распоряжении предприятий. На сессии облсовета принято и решение о 50% оплате за проезд в пригородных автобусах для дачников в предстоящий летний сезон.

СИМ.

ИЗ ЖИЗНИ ДЕНЕГ

ПРОЦЕНТ ПО ВКЛАДАМ. УСТАНАВЛИВАЕТСЯ МИНИМУМ

Сегодня многих граждан республики волнуют вопросы, касающиеся изменения процентных ставок по срочным депозитам, особенно по вкладам в Сберегательном банке. Особое недоумение у людей вызвало недавнее выступление в прессе заместителя главы Сбербанка А.Баркуна. В связи с этим пресс-служба Национального банка Беларуси доводит до сведения общественности, что решение о ежемесячной индексации вкладов (депозитов) граждан и юридических лиц, а также о переходе на ежемесячное установление процентных ставок по кредитам, правление Национального банка приняло еще 5 октября 1994 года. Причем эти решения в рамках основных направлений денежно-кредитной политики на 1995 год были согласованы со всеми крупными банками республики, в том числе с председателем Сбербанка В.Хилько. Тогда же было решено привязать ежемесячные процентные ставки к месячному уровню инфляции.

Разумеется, коммерческие банки, включая Сберегательный, были не в восторге от принятого решения, так как из-за начисления процентов (индексации вкладов) их собственные доходы значительно уменьшились. Эти указания не только не ущемляли вкладчиков в своих правах, но, наоборот, наконец-то гарантировали их сбережения от обесценения.

О том, что процентные ставки будут ежемесячно меняться с учетом роста цен на потребительские товары, было объявлено в вышеуказанном решении. И ничего неожиданного в изменении ставок в феврале для Сберегательного банка не было. Очевидно, руководство Сбербанка должным образом не организовало работу по доведению совместно принятого решения до собственных учреждений. Не были информированы и вкладчики, что вызвало многочисленные обращения в Национальный банк и недовольство граждан. В то же время любые договоры, в том числе и по вкладам, обратной силы не имеют. Наши указания относились исключительно ко вновь заключаемым соглашениям.

Что касается предполагаемых убытков, то они могли возникнуть лишь из-за плохой работы самого Сбербанка. Сберегательный банк в истекшие месяцы этого года мог свободно размещать денежные ресурсы под процентную ставку намного выше ставки по депозитам. Кроме того, Национальный банк гарантировал покупку свободных ресурсов Сберегательного банка по ставке рефинансирования коммерческих банков.

Следует иметь в виду, что ставки, устанавливаемые Национальным банком, по срочным вкладам в размере 25% и по вкладам до востребования 10% в месяц являются минимальными. Эти нормативы не ограничивают банки в возможности выплачивать более высокие проценты за использование привлеченных средств.

Также разъясняем, что все вклады граждан в банк являются депозитами. Поэтому процентная ставка одинаково не должна меняться в течение месяца по любому вкладу вне зависимости от того, как он назван при оформлении — срочный вклад или срочный депозит. Созданное в системе Сберегательного банка искусственное деление вкладов на срочные вклады, по которым ставка изменяется с 21 числа, и срочные депозиты, где она не подлежит изменению, является надуманным.

Пресс—служба Национального банка Беларуси.

У сродках масавай інфармацыі ўжо прагучалі імёны Жанчын года, вылучаных Усебеларускім жаночым фондам Ефрасінні Полацкай у розных галінах нашай дзейнасці. Усе яны будуць узнагароджаны медалём святой Ефрасінні Полацкай. Сёння мы пачынаем публікацыю матэрыялаў аб гэтых Жанчынах. Спачатку слова прэзідэнту фонду Ефрасінні Полацкай Валянціне Новік (Коўтун), вядомай пісьменніцы, аўтаркі рамана «Крыж міласэрнасці», шматлікіх паэтычных зборнікаў.

...І ЎЗБАГАЦІ СЭРЦЫ НАШЫ

Гэты год — год Жанчыны. Такім ён аб'яўлены ЮНЕСКА. Аднак гаворка — пра Жанчын года ў Беларусі. Пяшчотных і мудрых, высакародных і прафесіянальна дасведчаных, сярод якіх народная артыстка і грамадская дзеячка, міністр і банкір, супрацоўніца ААН, старшыня партыі, дырэктар фабрыкі. Усіх іх аб'яднала святое імя Ефрасінні Полацкай — асветніцы і міратворкі, ваяўніцы за спакой на зямлі роднай, годнай палітычнай дзеячкі і абаронцы люду паспалітага. Чула неадночы пытанне: чаму ўправаю фонду Жанчынамі году абраны менавіта яны — народная артыстка Стэфанія Станюта, лідэр Беларускай партыі жанчын «Надзея» Валянціна Палевікова, супрацоўніца ААН Наталля Дрозд, міністр аховы здароўя Інеса Драбышэўская, старшыня згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Ганна Сурмач, упраўляючая «Беларусьбанкам» Тамара Віннікава, дырэктар сумеснага прамысловага прадпрыемства Ларыса Кузняцова...

Прызнаюся, адразу ж пасля абвесткі пра Жанчын года мне давялося адказваць на многа пытанняў. Былі званкі з Гомеля, Брэста. Былі прапановы накшталт: «А вы забылі яшчэ пра такую цудоўную жанчыну...»



І называліся імёны... Даводзілася цярпліва паясняць. Не, справа зусім не ў тым, што мы забылі яшчэ некага адзначыць і ўзнагародзіць. Проста жанчын, вартых вялікай пашаны і ўхвалы, у нас, дарагія мае, як аказалася, вельмі многа! І ў мастацтве, і ў бізнесе, і ў палітыцы, у справе асветы і міласэрнасці. І гэта цудоўна. Аднак варта сказаць яшчэ пра адно. Важнае. Не хацелася б, каб вылучэнне Жанчын года ўспрымалася нашым грамадствам як ушанаванне толькі канкрэтных названых асоб. Задача фонду ў гэтым сэнсе значна шырэй і перспектыўней. Па-першае, мы імкнуліся засяродзіць увагу на тым, што жанчына Беларусі пачынае заваёўваць стабільны грунтоўны аўтарытэт не толькі ў сваіх дзяржаўных сценах, але і за мяжою.

Прычым, у розных кірунках і сферах палітыкі, эканомікі, навукі і культуры. Па-другое, у кола нашых задач уваходзіць таксама выяўленне балявых кропак жыцця. Упэўнена, што якраз у люстэрку адносін да жанчыны можна разгледзець не толькі кветкі і ўсмешкі, але і пачварныя грымасы хамства, дзікунства, нязўдзячнасці. На жаль, у гэтым люстэрку можна ўбачыць чорныя цені жабрацтва, беспрытульнасці, беспрацоўя... У такім выпадку ці можа беларуская жанчына цяпер спадзявацца і разлічваць толькі на мудрасць і спрыянне мужчын, што так часта займаюць крэслы дырэктараў, упраўляючых і да т.п. Але хто, як не нашы слаўныя дзяржаўныя мужы, давялі Беларусь да стану эканамічных і палітычных канвульсій?! І, здаецца, пасля́хова працягваюць і цяпер «наладжваць» сваю хваленую стабільнасць. Не... Я зусім не супраць таго, што ўжо дасягнута і прыносіць плён. Але я супраць... дыскрымінацыі жанчын. Дыскрымінацыі палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай. Жанчын-маці, жанчын-працаўніц, жанчын-ахоўніц роднай Беларусі. Аднак скажу — жанчыны павінны самі адстойваць свае правы змагацца актыўней і настойлівей. Ва ўсім, у мастацтве і эканоміцы, у медыцыне і палітыцы, ва ўсім жанчына павінна больш упэўнена даводзіць і свой прафесіяналізм, свой высокі ўзровень ведаў. З жанчынамі звязаны такія паняцці, як спакой, парадак, дзелавітасць, міласэрнасць. Час ужо ўсім паверыць канчаткова, час зразумець феменальнасць беларускай жанчыны. Пара зразумець, адчуць, што да кожнай сваёй справы беларуская жанчына адносіцца, прабачце за такое нечаканае параўнанне, як да свайго дзіцяці, ахвяруючы сілы, здароўе, цеплыню сэрца, дабрату, набыты жыццёвы вопыт, веды і талент. Урэшце — сваё жыццё. Будучае Беларусі — у жанчынах, у іх годных справах. Патрэбна толькі ўзаемная павага. Трэба толькі верыць. Верыць, згадаўшы словы малітвы: **«О найпадобная і праснапамятная, усеўхвальная маці Ефрасіння. Анёле ў плоці.**

...Запытай нам перад Госпадам даброты ў жыцці надзённым, узбагаці сэрцы нашы верай, надзеяй, любоўю...»

Так, верай, надзеяй, любоўю...

І апошняе. Пра жанчын, названых фондам Ефрасінні Полацкай Жанчынамі года і ўзнагароджаных медалём святой Ефрасінні Вялікай, многае ўжо ведома, многа друкавалася. Аднак нагадаць яшчэ раз пра нашых цудоўных суайчынніц — справа годная і карысная. Каб за іх, за нас усіх прагучала ў высокім небе малітва найпадобнай заступніцы нашай Ефрасінні. Малітва — за Бацькаўшчыну.

НА ЗДЫМКУ: Валянціна НОВІК (Коўтун) падчас святкавання Дзён памяці Ларысы ГЕНІЮШ у Зэльве.

Гутарка з ЖАНЧЫНАЙ ГОДА — лідэрам Беларускай жаночай партыі «Надзея» Валянцінай ПАЛЕВІКОВАЙ

«НАДЗЕЯ» З НАДЗЕЯЙ —

на высокі прафесіяналізм, абарончае пачуццё гумару і прыроджаную жаночую мудрасць

— Валянціна Цімафееўна, жанчына і палітыка... Гэта гармонія ці супярэчнасць? І як увогуле пачувае сябе жанчына палітычны лідэр сярод мужчын, якія лічаць сябе ў гэтай сферы «ўседзяржыцелямі»?

— Па-першае, лічу, што паняцце палітычнай дзейнасці для жанчыны ўнутрана гарманічнае. І самая важная, самая годная жаночая палітыка — гэта найперш палітыка жыцця. Калі хочаце, палітыка працягу роду чалавечага. Без гэтай важнейшай палітыкі чалавецтва ўсё іншае не мела б на нашай планеце аніякага сэнсу. Так што палітычная дзейнасць як намаганне прывесці наш хаатычны свет у пэўную сістэму, наладзіць гарманічныя стасункі паміж рознымі сацыяльнымі слаямі — вось такая палітычная дзейнасць якраз па плячы (хоць гэта ў адносінах да жанчыны гучыць нязвыкла), але менавіта палітыка. парадку і надзейнасці, стабільнасці ў грамадстве якраз па плячы моцнай і мудрай жанчыне.

— Вы робіце самарэкламу?

— Вось гэтым ніколі не грашыла. У маім характары хутчэй пераважае адваротнае.

— Аднак жа стварыць партыю, колькасць членаў якой перавышае дваццаць тысяч, тут ужо, згадзіцеся, без аўтарытэту і пэўнай сілы волі немагчыма.

— Вы забылі згадаць самае важнае.

— ?

— Вы забылі сказаць пра звычайнае працалюбства, часам нават цягавітасць, і асаблівую жаночую дыпламатыю. Да таго ж яшчэ сплаў прафесіяналізму з пачуццём міласэрнасці.

— Ці не маеце вы на ўвазе ўменне выслухаць кожнага, прыняць чужы боль за свой, дапамагчы чалавеку? Адным словам — быць з людзьмі чалавечнай? Дарэчы, паняцце чалавечнасці пасуе менавіта палітыкам-жанчынам. І ў большасці выпадкаў — толькі жанчынам. У гэтым сэнсе некаторыя мужчыны проста пацікаюць плячыма. Аднак, мы зноў вяртаемся да пытання, як адчувае сябе Жанчына года, да таго ж такая абаяльная, у той сферы чалавечай дзейнасці, пра якую так часта чуеш: «Палітыка — рэч брудная»?

— Адказ просты. Прабачце, я паўтару агульнавядомае: усё залежыць ад таго, у чые рукі трапляе тая самая «рэч» — палітыка! Хутчэй якраз цяпер важна зрабіць націск менавіта не на самім паняцці палітыкі, а на тых, хто гэтую палітыку стварае, хто праводзіць яе ў жыццё з якімі мэтамі. Адна справа — брудны сумнільны папулізм, далёкі ад сапраўдных клопатаў пра чалавека і народ. Зусім іншае — палітыка чалавека неабыякавага да дня сённяшняга і нашай будучыні. Гэта ўжо, вядома, палітыка сумлення, нават сумлення дзяржаўнага. І вось тут жанчына можа выйсці на першы план. Хоць бы як Маці, для якой клопат пра будучыню дзяцей, будучыню ўсёй краіны — справа ўсяго жыцця. Тут яна не можа лгаць альбо думаць найперш пра свае карысныя мэты, тут яна не можа здраджваць. Дарэчы, для мяне адна з галоўных чалавечых якасцей — быць верным.



— Вы верныя сваёй мроі?

— У пэўным сэнсе — так. Я па прафесіі матэматык-праграміст. Работа заўсёды была адказная — распрацоўкі сістэм. Цяпер таксама няпроста. Як сакратару выканкама прафсаюзаў Беларусі даводзіцца ўдзельнічаць у стварэнні больш складаных «сістэм» — у каардынацыі ўзаемаадносін паміж магутнымі механізмамі працоўных калектываў Беларусі.

— І ўсё ж, слухаючы Вас, Валянціна Цімафееўна, задаю сабе міжволі пытанне: ці не будзе часам жанчына ў палітыцы проста безабароннай? Мы ж такія адкрытыя, непасрэдныя перад рэзкім выказваннем, грубасцю, крыўдлівым кіўком у свой адрас. Разумею. Гэта агульная бяда. Агульны паказчык адукацыйнага і часта даволі нізкага культурнага ўзроўню грамадства. І ўсё ж трэба быць гатовай да рознага, ці не так?

— А вось тут могуць дапамагчы... пачуццё гумару і вытрымка. Каб зняць хвараватае ўспрыняцце нармальнай крытыкі, каб з годнасцю прымусіць зноў і зноў — паважаць сябе!

— Значыць, вы не бываеце слабай?

— А вось на гэтае пытанне, прызнацца, найцяжэй адказаць. Проста... Проста мне здаецца, што жанчына, якая адчувае сябе толькі ў стане ўзведзенага курка, — паверце, — далёкая ад сапраўднай жаночай годнасці, ад сапраўднага жаночага характару. А слабай мне, вядома ж, даводзіцца быць. Асабліва ў сям'і, у час адпачынку.

— Тады — якая ваша найбольшая слабасць?

— Захапленне горнымі лыжамі. Ужо на працягу многіх гадоў выязджаю разам з сынамі ў Карпаты, дзе адчуваю незвычайную злітнасць з высокім небам. І адпачываю душой.

— Магчыма, у наступны раз у высокіх Карпатах Вам, Валянціна Цімафееўна, будзе лягчэй «гаварыць» і з найпадобнай заступніцай Беларусі — Ефрасінняй Полацкай, медаль якой Вам будзе хутка ўручаны? І ці не будзе ў вашай «гаворцы» гучаць адзіна высокая і годная малітва — «Малітва за Беларусь»?

— А вось за гэтае пытанне — мая асаблівая ўдзячнасць.

Валянціна ЯСЕЛЬДА.

ТРЫ ГАЛОЎНЫЯ РОЛІ СТЭФАНІІ СТАНЮТЫ

СТЭФАНІЯ СТАНЮТА. Шмат сказана, напісана і паказана па тэлебачанні пра гэту таленавітую актрысу, самабытную стваральніцу арыгінальных мастацкіх вырабаў і проста выдатнага Чалавека. За сваё жыццё яна сыграла ў тэатры і кіно незлічоную колькасць роляў, у большасці сваёй вядучых. Пра гэта таксама нямала сказана. Але амаль не даводзілася чуць пра самыя галоўныя ролі ў жыцці гэтай жанчыны — ролі маці, бабулі і прабабулі.

Няма для жанчыны, нават самай вялікай актрысы, больш значнай місіі на зямлі, як мацярынства. І яе Стэфанія Міхайлаўна Станюта выканала спаўна.

РОЛЯ ПЕРШАЯ: МАЦЯРЫНСТВА

— Падараваць жыццё чалавеку! Гэта нават немагчыма да канца ўявіць, — гаворыць Стэфанія Міхайлаўна. — Цуд, які можна параўнаць хіба што са стварэннем свету. Кожны чалавек — гэта ж асобны, непаўторны свет. І раптам — ты яго стваральнік!.. Ад шчасця, што ў мяне нарадзіўся сын, я нават спаць перастала. Здавалася, калі я засну і прачнуся, то ў мяне яго ўжо не будзе. Саша ў мяне, як бы то мовіць, позняе дзіця. Нарадзіла яго, калі мне было ўжо за 30. Спачатку вучылася. Потым — праца ў тэатры. Пайшлі ўсё больш вядучых ролі. Не хацелася перапыняцца, тым больш, што гэтая справа была для мяне галоўнай у жыцці. І толькі з нараджэннем сына я зразумела, дзе і ў чым сапраўдны сэнс і сапраўднае шчасце жанчыны. Хаця тады і жылося цяжка. Калыскай для сына быў чамадан, які мы прыстасавалі да крэслаў.

— Нехта ж дапамагаў гадаваць хлопчыка? Бо ў тыя часы жанчына не мела магчымасці знаходзіцца ў дэкрэце нават год. Ды і тэатр Вас, напэўна, клікаў?

— Галоўнымі памочнікамі былі: маці мужа Караліна Стэфанаўна і наогул уся сям'я Кручынскіх, а таксама мой бацька і яго жонка Клаўдзія Пракопаўна. Да таго ж, праз прафсаюз хатніх гаспадынь я наняла сыну няньку. Вельмі добрая аказалася жанчына. Калі хлопчыку споўнілася чатыры з паловай гады, я павінна была ехаць на гастролі. Хацела яго ўзяць з сабой, але доктарка забараніла, таму што Саша рос слабенькім і хваравітым. Пастаянныя пераезды і перамена клімату, канечне, не прыбавілі б яму здароўя. Я зняла для сына дачу за горадам, як параіў урач, а сама паехала з тэатрам у Адэсу. Там нас і напаткала вайна. У хуткім часе мы былі эвакуіраваны ў Новасібірск, а потым — у Томск.

— Усю вайну — без сына. Уяўляю, як Вам было цяжка. А звесткі аб ім былі якія?

— У сярэдзіне вайны наш рэжысёр Канстанцін Саннікаў паехаў у Маскву, каб прасіцца на фронт. Яму вельмі хацелася ўдзельнічаць у вызваленні Мінска. У Маскве ён сустрэў жонку кампазітара Любана, якая жыла да таго ў Мінску — партызаны вывезлі яе прама з-пад носа немцаў. Дык вось у Мінску яна бачыла майго сына жывым, здаровенькім і паведаміла пра гэта Саннікаву. А ён прыслаў да нас у Томск тэлеграму. Самі разумееце, што гэта для мяне азначала.

— А пасля вайны як сустрэліся з сынам?

— Я ўдзячна Богу за тое, што гэта сустрэча наогул адбылася. Справа ў тым, што цягнік, якім мы вярталіся з Томска, пацярпеў крушэнне — рэйкі былі разарваны. Нашых тады загінула дзевяць чалавек. Ну, а ў Мінску пайшлі чуткі, што загінулі ўсе. Колькі ж радасці было, калі я вярнулася жывая і здаровая!

Саша мой у той час ужо хадзіў у школу. Аднаго на вуліцы я яго ні за што б не пазнала. Пакідала яго малым дзіцяткам са светленькімі кудзеркамі. А тут убачыла цыбатага хлапчука.

— А Сашаў бацька, ён...

— З Сашавым бацькам мы развяліся ў 1940 годзе, калі сыну было 4 гады. Тады ён сябе і вырашыла, што айчыма ў сына не будзе. Я вельмі сябравала са сваёй свякроўкай і тая ўвесь час прасіла: «Стэфачка, толькі не дай майму ўнучку чужога бацьку».

— Вы, пэўна, добра памятаеце маленства сына?

— Як і ўсе маці. З самага маленства ён вельмі любіў, каб я чытала яму казкі, расказвала нейкія гісторыі. Сам сачыняў нешта і мяне прасіў дапамагаць ў гэтым. Песеньки з ім пелі, бывае, настукаю мелодыю, а ён тут жа праспявае. Па характару гэта было ласкавае, пяшчотнае дзіця.

Памятаю і такое. Да нас у госці часта прыходзілі сяброўкі з тэатра — прыгожыя актрысы. У тыя часы ў нас было шмат прыгажунь у тэатры. І вось калі яны пойдуць, я пытаю ў Сашы: «Праўда, сынок, вельмі прыгожыя цёці?» А ён у адказ: «Ти самая лучшинькая всех».

А вось адну маю прыяцельку проста неўзлюбіў. Тая звычайна заходзіла да мяне, каб разам ісці ў кіно ці то ў парк. Як толькі яна на парог, сын мой у голас. Бывае, праз акно ўбачыць, як яна ідзе па вуліцы — ад крыку заходзіцца.

— Ваш сын не імкнуўся стаць артыстам, як мама?

— Не. Хаця неаднаразова спрабавала зацікавіць яго гэтым. У Палацы піянераў, напрыклад, вяла драмгурток, куды заўсёды брала Сашу. Але ён ніякай цікавасці да акцёрскай справы не праявіў. Больш бегаў на пажарышчы гуляць у футбол. З хлопцамі паробяць вароты з цэглы і днямі брудныя, абдзёртыя ганяюць мяч.

— Лёсам свайго сына Вы задаволены?

— Свой шлях у жыцці сын выбраў сам. І я паважаю яго выбар. Ён працаваў у журналістыцы. А потым зацікавіўся Дастаеўскім. Без перабольшання скажу: сын мае вялікія веды па творчасці гэтага рускага класіка, як і наогул па рускай класічнай літаратуры, — гэта яго навуковая спецыяльнасць.

Сёння Аляксандр Аляксандравіч Станюта — дацэнт Белдзяржуніверсітэта, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Адна з яго кніг — «Стэфанія» — пра мяне... А нявестка мая Ірына — прафесар, таленавіты эканаміст і выдатная гаспадыня. Увогуле ўся наша сям'я — людзі творчыя. І сын майго бацькі ад другога шлюбу — Уладзімір Станюта — яшчэ адно пацвярджэнне гэтаму, ён мастак...

РОЛЯ ДРУГАЯ: БАБУЛЯ

— У народзе гавораць, што ўнукаў звычайна любяць больш, чым сваіх дзяцей. Вы згодны з гэтым?

— Унукі — гэта ў некаторай ступені вяртанне ў сваю маладосць, аднаўленне пачуццяў. Хаця я ніколі не задумвалася над сілай пачуццяў да сына і ўнука. На мой погляд, любові не можа быць шмат ці мала. Яна ёсць ці яе няма. Ну, а як жа можна не любіць маленькую істоту, сваю крывіначку!

Калі з'явіўся мой унучак Дзімачка я ад шчасця зямлі пад сабой не бачыла. Лётала быццам на крылах. Вельмі чакала яго, нават у сне бачыла. Дзіма, як і сын мой, — позняе дзіця.

Безумоўна, ўсе над ім дрыжэлі, можа, нават і песцілі. І я шмат часу ўдзяляла свайму ўнучку. Маю шмат фотаздымкаў, як кажуць, ад калыскі да школы, потым — да арміі і — аж да цяперашняга часу, калі ён ужо сам стаў бацькам. Ёсць фотакартка, дзе мы з другой бабуляй — Верай Паўлаўнай — нават прытанцоўваем каля малога Дзімы. Адна яго забаўляе, а другая лыжку з кашай спрабуе ўкласці ў рот — вельмі дрэнна еў у дзяцінстве.

Але, дзякуй Богу, вырас здаровым, моцным. Вельмі самастойны, разважлівы. Скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, працуе па спецыяльнасці. Адным словам, талковы хлопец. Я ім вельмі задаволена.

РОЛЯ ТРЭЦЯЯ: ПРАБАБУЛЯ

— Праўнучка Меліта — гэта мая найдаражэйшая, найпрыгажэйшая кветачка. Дзякуй Дзімачку і яго жонцы за такі падарунак! — гаворыць Стэфанія Міхайлаўна. — Ёй ужо споўнілася адзін годзік і чатыры месяцы. На вялікі жаль, я яе бачу рэдка. Зараз вось ужо тры месяцы амаль не ўстаю з ложка — хварэю.

Неяк прыйшоў да мяне ў бальніцу Дзіма і расказаў пра Меліту сапраўднае дзіва. Нядаўна па тэлебачанні ішла перадача, у якой і я прымала ўдзел. Малая наша глянула на экран і ўскрыкнула: «Баба!» Я Дзіме кажу, што гэтага не можа быць, яна мяне не магла пазнаць. Можа, проста сказала «баба» — у сэнсе старэнькая жанчына. Але ўнук упэўніў, што ў мяне асобны тэмбр голасу, Меліта яго пазнае. Маўляў, гэта было відаць і па твары дзяўчынкі.

Прашу Бога, каб даў ёй здароўя і шчасця.

Мы гутарылі са Стэфаніяй Міхайлаўнай ў бальніцы падчас яе выпіскі дамоў. Новы, спакойны, хатні рэжым жыцця — нязвыклы чалавеку энергічнаму, які без сцэны не ўяўляе свайго існавання. Мы жадаем Стэфаніі Міхайлаўне хутчэйшага поўнага выздараўлення!

Галіна КАЛЕВІЧ.

ЛЮБОЎЮ СПРАВЫ САГРАВАЦЬ

